# Галоўная бібліятэка рэспублікі

Дзяржаўная ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга бібліятэка БССР імя У. І. Леніна — скарбніца культуры, буйнейшае кнігасховішча Беларусі, рэспубліканскі цэнтр навукова-метадычнай і навукова-бібліяграфічнай работы.

Яе фонды налічваюць сёння каля сямі мільёнаў твораў. Тут сабраны найкаштоўнейшыя кнігі, у тым ліку прыжыццёвыя выданні К. Маркса, Ф. Энгельса, У. І. Леніна, беларускага першадрукара Ф. Скарыны, першыя зборнікі Я. Купалы, Я. Коласа, М. Багдановіча... Бібліятэка мае матэрыялы па розных пытаннях навукі, тэхнікі, літаратуры і мастацтва.

Людзі рознага ўзросту і прафесій прыходзяць у «ленінку», каб папоўніць запас ведаў. У бібліятэцы ёсць 12 чытальных залаў, куды прыходзяць штогод звыш чатырохсот тысяч чалавек. Праз міжбібліятэчны абанемент паслугамі галоўнай бібліятэкі рэспублікі карыстаюцца жыхары многіх беларускіх гарадоў і вёсак.

Вялікая ўвага ўдзяляецца паляпшэнню абслугоўвання працаўнікоў аграпрамысловага комплексу літаратурай аб дасягненнях сельскагаспадарчай навукі, вопыце перадавікоў паляводства і жывёлагадоўлі.

Пастаянна расшыраюцца зарубежныя культурныя сувязі «ленінкі». Цяпер яна падтрымлівае іх з бібліятэкамі амаль 30 краін свету.

**На здымках:** у аддзеле бібліятэчнай апрацоўкі і каталагаў.

Фота **У. Мяжэвіча.** (БЕЛТА).

